**Міні – дапаможнік па фатаграфіі**

Каб атрымаліся цудоўныя фота, не абавязкова мець круты фотаапарат ці ісці да прафесійнага фатографа. Дастаткова прытрымліваецца простых правілаў.

Першае, і асноўнае, – правіла "залатога сячэння". Правіла ўніверсальнае для ўсіх тыпаў фатаграфій. Сутнасць: існуе 4 асноўных сэнсавыя кропкі, якія нясуць сэнс здымка. Перад тым, як зрабіць здымак, у думках накладзіце сетку, як на малюнку ніжэй:



У ідэальным выпадку сетка павінна падзяляць кадр на 3 роўныя часткі па вышыні і 3 па шырыні.

Аб'екты здымка павінны знаходзіцца на скрыжаванні ліній (у тых самых 4 кропках, што нясуць сэнс здымку) або ўздоўж іх.

Добры прыклад, на які можна арыентавацца :




Старайцеся не здымаць так, каб аб'екты здымкі былі ў цэнтры.

Калі цяжка "разбіць" кадр на часткі, то можна скарыстацца функцыяй "сетка", якая ёсць амаль ва ўсіх фотаапаратах.

Другое: будзьце ўважлівымі з фонам, на якім робіцца здымак. Сачыце за тым, каб не атрымлівалася, што з галавы чалавека тырчыць дрэва ці што-небудзь яшчэ.

Трэццяе: Старайцеся, каб аб'ектыў фотааппарата знаходзіўся на ўзроўні вачэй чалавека, якога Вы здымаеце. Але пры гэтым зусім не абавязкова, каб чалавек глядзеў прама ў

аб’ектыў. Памятайце, калі чалавек глядзіць не ў аб’ектыў, то трэба пакінуць пустой тую частку кадру, куды накіраваны яго погляд.

Напрыклад:




Для групавых фота можна арыентавацца на такі прыклад:




Кали фатаграфуеш групу, то заўсёды цяжка злавіць той момант, калі ўсе глядзяць ў аб’ектыў і стаяць роўненька, усміхаюцца і не зачыняюць вочы . Таму трэба старацца не “рэзаць” людзей на здымках, сачыць, каб ў кадр траплялі таблічкі, а на пярэднім плане не было нічога лішняга.

Апошняе, і самае галоўнае: калі здымкі не атрымліваюцца, не трэба хвалявацца. У любой справе галоўнае - практыка. Таму фатаграфуй яшчэ!

Жадаем Вам добрых і прыгожых здымкаў!